ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (814) ● Чацвер, 20 мая 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

РАШЭННІ XXIV з'езда — у жыццё

## ПЛАНЫ КАФЕДРЫ ЎДАКЛАДНЕНЫ

Сярод пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар XXIV з'езда КПСС — кафедра мікрабіялогіі біялагічнага факультэта. Яе калектыў, які ўзначальвае прафесар Юрый Канстанцінавіч Фамічоў, за высокія паказчыкі ў выкананні перадз'ездаўскіх сацыялістычных абавязацельстваў узнагароджан Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

З верасня 1970 года шмат зроблена тут па ўдасканаленню вучэбнага працэсу. Уведзены, напрыклад, новыя спецкурсы па мікрабіялогіі, звязаныя з мэтанакіраванай падрыхтоўкай спецыялістаў для народнай гаспадаркі («Селекцыя карысных форм мікраарганізмаў», «Мікробныя метабаліты», «Водная мікрабіялогія»). Распрацаваны метадычны дапаможнік па напісанню курсавых і дыпломных работ.

Многія супрацоўнікі кафедры ў сакавіку-красавіку бягучага года прынялі актыўны ўдзел у юбілейнай канферэнцыі па выніках навукова-даследчых работ. Вольга Іванаўна Калешка выступала з навуковым дакладам на VI Усесаюзнай нарадзе біяхімікаў. Была арганізавана выстаўка навуковых работ кафедры.

Многае рабілася і ў галіне выхаваўчай работы. Праводзіліся гутаркі са студэнтамі, якія спецыялізуюцца на кафедры, аб падрыхтоўцы да XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя БДУ, аб развіцці кафедры і інш.

Цяпер адпаведна з рашэннямі XXIV з'езда Камуністычнай партыі, дзе асаблівая ўвага звернута на пашырэнне работ па меліярацыі забалочаных глебаў, унесены значныя змены ў планы навуковых даследаванняў гэтай кафедры. Асноўныя намаганні супрацоўнікаў, студэнтаў-практыкантаў і дыпломнікаў у новай пяцігодцы будуць сканцэнтраваны на выкананні вялікай тэмы: змяненне асацыяцый арганізмаў на меліяраваных землях і ўплыў гэтых змен на карысныя арганізмы, якія знаходзяцца ў глебе. Для выканання гэтай тэмы намечана правесці комплекс даследаванняў сумесна з лабараторыяй геахіміі глебаў геаграфічнага факультэта.

Цяпер на кафедры мікрабіялогіі ідзе падрыхтоўка да навукова-тэарэтычнай канферэнцыі студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу, на якой мяркуецца абагульніць навуковыя даследаванні бягучага навучальнага года.

У сувязі з задачамі, пастаўленымі XXIV з'ездам КПСС у галіне меліярацыі, у будучым годзе намячаецца ўвесці новы спецкурс: экалогія мікраарганізмаў.

Л. ЗОРЫНА.

## ЦІКАВАЕ ЗНАЁМСТВА

**У аўторак гасцямі факультэта журналістыкі былі рэдактары маладзёжных выданняў Югаславіі: Дзеян Гаіч — рэдактар белградскай ілюстраванай газеты «Сустрэчы» і Стэфан Чуіч — галоўны рэдактар штомесячнай газеты «Зямля».**

**Гасцей прымаў дэкан факультэта Р. В. Булацкі. На сустрэчы прысутнічалі загадчыкі кафедр факультэта, выкладчыкі, камсамольскія актывісты, журналісты.**

**Р. В. Булацкі расказаў гасцям аб гісторыі факультэта, сістэме падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у рэспубліцы.**

**Югаслаўскія журналісты агледзелі вучэбны корпус, кабінеты. Асабліва спадабаліся ім насценныя газеты. Цікавіліся госці і вучобай, і адпачынкам беларускіх студэнтаў.**

**Л. ЧАРНОВА.**

## БДУ — ІМЯ ГАНАРОВАЕ

Лісце на дрэвах толькі прабівалася, калі мы выехалі з Мінска. Вярталіся дамоў—цвілі сады.

Агітпрабег «БДУ-50», як мы і разлічвалі, працягваўся два тыдні. Мы прайшлі па дарогах роднай Беларусі 1.200 км. І тое, што бачылі, з чым пазнаёміліся, надоўга застанецца ў памяці, будзе хваляваць, поўніць гонарам за росквіт нашай рэспублікі, за яе багацці, за народ—гасцінны, шчыры і працавіты, за маляўнічыя куткі, дзе так цудоўна адпачываецца, дзе звонкае салодкае паветра, бярозавыя гаі, рэкі і чыстыя крыніцы.

Мы быццам прачыталі жывую кнігу аб роднай Беларусі, адчулі яе працоўны пульс, сустрэліся з людзьмі розных пакаленняў. Мы ўпэўніліся, з якой павагай адносяцца людзі да Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, як радуюцца яго дасягненням, як шчыра вітаюць са святам.

Аднойчы я пачуў словы ад чалавека, які ніколі не вучыўся ў нашым БДУ: «Універсітэт — імя ганаровае, і вучыцца ў ім — вялікае шчасце...»

З сённяшняга нумара мы і пачнем расказ аб незабыўных уражаннях і назіраннях — аб усім, з чым сустрэліся на сваім маршруце ўдзельнікі агітпрабегу «БДУ-50», прысвечанаму прапагандзе рашэнняў XXIV з'езда КПСС і 50-годдзю нашага універсітэта.

### ПЕРШАЯ СТАРОНКА ДЗЁННІКА (Стоўбцы)

На гарадскім стадыёне—выпускнікі сярэдніх школ раёна. Яны сабраліся на злёт, каб яшчэ раз задумацца: па якой дарозе крочыць у самастойнае жыццё.

Калона выпускнікоў накіроўваецца да помніка загінуўшым воінам. Нашы матацыклісты са сцягамі — галаўныя.

На плітах — сотні прозвішчаў. Іх нельга забыць, як не забудзеш сваё імя. Змаўкаюць галасы. Твары юнакоў і дзяўчат хмурнеюць, становяцца па-даросламу суровымі. Да паднlocal кладуцца кветкі. Блакітныя кветкі вясны — рукамі вясны жыцця. Потым мы ідзем да помніка Леніну...

У раённым Доме культуры перад выпускнікамі—людзі розных спецыяльнасцей і прафесій. І, вядома, кожны ратаваў за сваю. З вялікай увагай выслухалі выпускнікі расказ аб Беларускім дзяржаўным універсітэце, аб яго гісторыі, факультэтах, аб жыцці і вучобе студэнтаў. З лекцыямі выступалі дацэнт кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў В. А. Баркан і старшы выкладчык кафедры электронных матэматычных машын П. Л. Салаў.

Цудоўна жыць у краіне, дзе дзверы ў храмы навукі шырока адкрыты перад кожным маладым савецкім чалавекам. Цудоўна адчуваць і ведаць аб пастаянных клопатах партыі ў галіне адукацыі моладзі, клопаты аб студэнцтве — такая думка была ў выступленнях сёлетніх выпускнікоў сярэдніх школ раёна.

Перад выпускнікамі выступілі і нашы «землякі» — эстрадны ансамбль фізічнага факультэта.

Вось і першае выпрабаванне. Пазней мы падвядзем вынікі. Пазней навучымся самай высокай аператыўнасці. Пазней мы многае ўлічым і зразумеем. А пакуль што прыйшлося задаволіцца тым, што зроблена. Мы ўдала «ўпісаліся» ў калону, сталі як бы часткай маладой, рознагалосай аўдыторыі (дарэчы, Стаўбцоўскі раён—наш падшэфны раён), і студэнты нашы бываюць у школах вельмі часта, што дало магчымасць размаўляць больш шчыра і пераканаўча.

У гасцініцы нам адвялі нумары. Адпачнем—і ранкам у дарогу. У Нясвіж.

**Л. ЕКЕЛЬ, удзельнік агітпрабегу.**



⊙

**На здымку:** дыпломную работу на тэму «Папярэджанні злачынстваў непаўналетніх» абараняе следчы Цэнтральнага аддзялення міліцыі г. Гомеля, студэнт-завочнік VI курса юрыдычнага аддзялення Георгій Рыгоравіч **Лобанаў.**

**Фота Д. ЧАХОВІЧА.**

⊙

*ДАВАЙЦЕ АБМЯРКУЕМ*

## А КАЛІ ПА-ІНШАМУ?..

Кожны год ва універсітэце праводзяцца традыцыйныя студэнцкія навуковыя канферэнцыі. І кожны год у рабоце секцый удзельнічае вялікая, але разам з тым і абмежаваная колькасць студэнтаў. Вялікая — таму, што павялічваецца колькасць дакладаў, паведамленняў, зробленых студэнтамі; абмежаваная — таму, што ў рабоце секцый у асноўным удзельнічаюць толькі дакладчыкі. Цяжка чакаць змен у лепшы бок пры цяперашняй арганізацыі работы секцый. Уся бяда заключаецца ў непрадуманай арганізацыі, у бязладным падборы тэматыкі секцый (па тэрытарыяльнаму прызнаку — вучобы студэнта на даным факультэце, прыналежнасці кафедры да пэўнага факультэта).

Мы прааналізавалі праграмы дзвюх папярэдніх канферэнцый і цяперашняй, 28-й, якая нічым не адрозніваецца ад мінулых. Яна — тыповы ўзор такой бязладнасці.

На факультэце прыкладной матэматыкі працавала секцыя гісторыі КПСС, на гістарычным факультэце працавалі дзве падсекцыі гісторыі КПСС. Праграма канферэнцыі абвяшчае, што на першым будзе даклад на тэму «Тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі», на другім — два даклады «Ленінская тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі аб шляхах пераходу да сацыялізму» і «Ленінская тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі і сучаснасць». У секцыі гісторыі КПСС фізічнага факультэта таксама стаяць два даклады: «Ленінская тэорыя перарастання буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную» і «Далейшае развіццё марксісцка-ленінскага вучэння аб пераходзе краін да сацыялізму» і іншыя.

Як бачым, падобныя тэмы сустракаюцца ў розных секцыях, а ў адной секцыі мы часта знаходзім рознатэмныя даклады, якія адрозніваюцца адзін ад другога нават па профілю. У рабоце секцыі № 3 ФПМ, адпаведна праграме, былі абмеркаваны даклады «Стварэнне новай сацыялістычнай інтэлігенцыі — адна з важнейшых задач пабудовы камунізму» і «Умовы інварыянтнасці кампазітных сістэм» — ну і цуды!

Мноства разнатэмных дакладаў, натуральна, зніжае зацікаўленасць і саміх дакладчыкаў да зместу дакладаў сваіх таварышаў. Секцыя марксісцка-ленінскай філасофіі пры гістарычным факультэце абмяркоўвала даклады «Крытыка фальсіфікацый закона адмаўлення ў антымарксісцкай літаратуры», «Свядомасць і самасвядомасць», «Дыялектыка ўзаемасувязі навукі і тэхнікі ў сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі», якія не аб'яднаны адной тэматыкай. У праграме работы розных секцый гістарычнага факультэта ёсць многа аднатэмных дакладаў, якія маглі б быць аб'яднаны і праслуханы адной секцыяй.

І нам, і іншым студэнтам, якія займаюцца, напрыклад, даследаваннем праблемы навукова - тэхнічнага прагрэсу, цікава было б праслухаць даклады «Усямернае разгортванне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі — адзін з рашаючых участкаў барацьбы сацыялізму супраць капіталізму» (секцыя гісторыі КПСС на ФПМ), «Уплыў агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі рабочых на рост

(Заканчэнне на 2-й стар.)



# А КАЛІ ПА-ІНШАМУ?..

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

вытворчасці працы» (секцыя № 3 ФПМ), «Адзінства навукова - тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу ва ўмовах сацыялізму» (секцыя навуковага камунізма фізічнага факультэта), «Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і праблемы камуністычнага выхавання моладзі» (секцыя марксісцка-ленінскай філасофіі гістарычнага факультэта), «Навукова-тэхнічны прагрэс у сацыялістычнай сельскай гаспадарцы» (секцыя палітычнай эканоміі гістарычнага факультэта) і іншыя. Гэта дазволіла б вывучаемую праблему, па-першае, разгледзець з розных бакоў — філасофскага, эканамічнага, сацыялагічнага, дазволіла б пачуць меркаванне па якой-небудзь праблеме і фізікаў, і філосафаў, і матэматыкаў, і гісторыкаў, і палітэканомаў; па-другое, калі б секцыя разглядала якое-небудзь адно пытанне (як у падсекцыі міжнароднага маладзёжнага руху), то састаў удзельнікаў зацікавіў бы і тых студэнтаў, якія пішуць курсавыя работы або цікавяцца данай праблемай, хоць і не выступаюць з дакладамі.

І ўдзельнікі і проста слухачы пачарпнулі б многа думак, утварылася б творчая садружнасць. Такі парадак работы канферэнцыі ўзбагаціў бы кожнага студэнта. Узніклі б кваліфікаваныя пытанні не толькі ў выкладчыкаў, але і ў студэнтаў, і гэта садзейнічала б паляпшэнню навуковай работы ва універсітэце. Акрамя таго, з творчасцю дакладчыкаў пазнаёмілася б больш шырокае кола студэнтаў, бо ў цяперашні час даклады, прадстаўляемыя на канферэнцыю, у большасці сваёй загадзя разглядаюцца на пасяджэннях студэнцкіх навуковых гурткоў пры кафедрах, пры якіх жа на аснове работы гэтых гурткоў і арганізуюцца секцыі. Гэта значыць, што адны і тыя ж студэнты часам двойчы, а то і тройчы знаёмяцца з данай работай, калі яна абмяркоўвалася на семінары або спецсемінары.

Вось чаму так неабходнай здаецца нам перабудова навуковых студэнцкіх канферэнцый.

**А. ЗЛОТНІКАЎ,**
**Л. ДАВЫДЗЕНКА,**
**студэнты гістарычнага факультэта.**



**На здымку:** залік па англійскай мове здае студэнт І курса Уладзімір **Кузьмін**. Прымае ст. выкладчык Канстанцін Радыёнавіч **Апярэнка.**

Фота **Д. Чаховіча.**

# НЕ ДАПАМОЖА І МАЙСТЭРСТВА

Аб тым, што ва універсітэце ёсць вучэбна-вытворчыя майстэрні, ведаюць многія, але аб іх рабоце, аб поспехах і клопатах, адным словам, аб буднях ведаюць хіба што фізікі. Таму што майстэрні—іх вучэбная база. Каменціруючы ў назве майстэрань слова «вучэбныя», загадчык Міхаіл Іванавіч Юзафовіч расказвае:

— На базе нашых майстэрань праводзяцца практычныя заняткі многіх студэнцкіх груп. Першакурснікі фізічнага факультэта вывучаюць цяслярную і гакарную справу, металаапрацоўку. З гэтымі студэнтамі працуе добры спецыяліст і вопытны настаўнік Міхаіл Фёдаравіч Верацёнаў. З другакурснікамі па фотаспраўе праводзіць заняткі Георгій Рыгоравіч Марозаў. Па радыёсправе практыку праходзяць радыёфізікі II і III курсаў. У дрэваапрацоўчых цэхах займаюцца географы.

У цэхах майстэрань можна сустрэць і першакурсніка, які рыхтуе патрэбны макет да курсавой работы, і выпускніка, які працуе над дыпломнай работай. Гэтага пераліку, вядома, мала, каб паказаць удзячную працу гэтага калектыву. Можна яшчэ павесці размову аб удачных навуковых вопытах, якія праводзіліся на эксперыментальных прыборах, прыгатаваных у майстэрнях. На ваеннай кафедры вы заўважыце з густам зробленыя стэнды для макетаў рэльефу мясцовасці, стэнды, выкарыстоўваемыя для падрыхтоўкі вадзіцеляў аўтамабіляў, і яшчэ многа наглядных дапаможнікаў, мадэлей і макетаў. Адрас вырабу — таксама майстэрні, дрэваапрацоўчы цэх.

Выдатна працуюць тут маладыя рабочыя, камсорг адміністрацыйна - гаспадарчай часткі фрэзероўшчык Аркадзь Дабрусін, токар Уладзімір Камароўскі. Але, аказваецца, гэтага мала.

Што ж перашкаджае паспяховай рабоце майстэрань?

Калі разгледзець структурную схему адносін майстэрань з рознымі аддзеламі і факультэтамі, то можна заўважыць прамую сувязь з аддзелам матэрыяльнага забеспячэння, з аднаго боку, і з мноствам заказчыкаў, з другога. Вось і атрымліваецца, што дзесяткі заказчыкаў патрабуюць выканання сваіх заданняў, а адзін аддзел забеспячэння не забяспечвае патрэбным матэрыялам. Напрыклад, цяпер многія заказы не закончаны з-за адсутнасці труб адпаведнага дыяметра, стальных вугалкоў для вырабу каркасаў прыбораў. Далі неяк заяўку ў аддзел забеспячэння на пастаўку разьбовых разцоў унутранай і знешняй разьбы. Праходзіць тэрмін, і загадчык атрымлівае адразныя разцы.

— Вось ужо два-тры гады, — гаворыць Міхаіл Іванавіч, — мы просім свердлы дыяметрам 6,3 і 6,7 мм, а атрымліваем на 7,1 або 7 мм. Мечыкі прасілі на 3 і 4, а даюць на 6 мм.

У дапаўненне яшчэ пытанне «КВЗ». На які тэрмін можа хапіць 50 нажовачных палотнаў, калі ў заяўцы 500? А гэты ж дакумент складаецца зыходзячы з намечанага плана работ.

Не лепшая справа і з дастаўкай матэрыялаў. Заказалі для майстэрань патрэбную колькасць дробнасортнай сталі, а база адпусціла буйнасортную сталь. У нас яе прымяніць практычна немагчыма, акрамя як адразу адвезці на металалом. Затое база і аддзел забеспячэння свае абавязкі нібыта выконваюць. Патрэбныя тоны здаюць—патрэбныя тоны прымаюць. І нікога не цікавяць транспартуючыяся тоны сталі і жалеза ў лістах, ці гэта вугольнікі, ці гэта адзін цэльны злітак. Тоны ёсць — і гара з плеч аддзела забеспячэння. Ад такой «дзейнасці» карысці мала.

Работнікам забеспячэння трэба не скардзіцца, што нідзе нічога няма, а праяўляць больш ініцыятывы.

**М. ІНІН.**

# КАНДРАТ КРАПІВА— СТУДЭНТ БДУ

13 красавіка 1922 года ў газеце «Красноармейская правда» быў надрукаваны вершаваны фельетон на рускай мове «Жили-были». Гэта быў першы твор маладога пісьменніка Кандрата Крапівы. Самая галоўная асаблівасць усёй яго творчасці — народнасць. Многія вершы паэта ўвайшлі ў фальклор, яны перадаюцца з вуснаў у вусны, бытуюць як песні і частушкі, завучваюцца напамяць. Шмат выразаў з твораў пісьменніка зрабіліся крылатымі.

Першыя ж творы маладога паэта набылі вялікую папулярнасць. Адзін за адным выходзілі ў свет сатырычныя зборнікі Крапівы: «Асцё» (1925 г.), «Крапіва» (1925 г.). Настаўніцтва, служба ў царскай арміі, зноў настаўніцтва, Чырвоная Армія — вось шлях маладога пісьменніка, шлях, на якім «збіраўся» яго літаратурны багаж.

Але жыццё ў літаратуры патрабавала перш за ўсё многа ведаў. А ўсе тыя веды, што ён меў, былі набыты амаль што самаадукацыяй. І вось у пачатку 1926 года Крапіва вырашыў стаць студэнтам. Якая прага ведаў, якая настойлівасць у дасягненні мэты — на 31-м годзе жыцця паступаць вучыцца ў БДУ! Цяжка было, маючы сям'ю, прайшоўшы немалы жыццёвы шлях, сесці за парту, узяцца за падручнікі. Але трэба было запоўніць, як ён сам казаў, «вялікі прабел у сваёй адукацыі».

І літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ папоўнілася новым студэнтам Кандратам Атраховічам, якога ўсе ведалі як пісьменніка - байкапісца Кандрата Крапіву. Малады пісьменнік быў выдатным студэнтам, хоць і нялёгка было сядзець за падручнікамі да позняй ночы, уважліва канспектаваць лекцыі, удзельнічаць у розных гуртках, у грамадскай працы і адначасова пісаць вершы, байкі, апавяданні.

Студэнт-першакурснік адразу ж заваяваў павагу да сябе з боку сяброў-аднакурснікаў і старэйшых таварышаў. Заўсёды стараны, падцягнуты, ён ведаў намнога больш таго, што належала ведаць студэнту па праграме, і сваімі добрымі і глыбокімі адказамі ствараў вельмі прыемнае ўражанне. Усе свае сілы ён аддаваў у той час паглыбленню ведаў. Але адначасова прымаў актыўны ўдзел у літаратурным жыцці рэспублікі. 11 студзеня 1926 года студэнт-першакурснік Атраховіч чытае на сходзе Мінскай філіі «Маладняка» сатырычную паэму «Біблія». Пра тое, як быў успрынят гэты твор, піша В. Таўлай: «Усюды, куды трапляла кніга Быція Крапівы, яна рабіла сапраўдны фурор. Яе перапісвалі, і яна хадзіла ў сотнях рукапісных экземпляраў. Яе завучвалі напамяць, і ва ўсіх кутках Заходняй Беларусі сустракаліся дзядзькі, якія маглі прадэкламаваць не толькі паасобныя часткі, але ўсю «Біблію» ад пачатку да канца».

Першы курс. Ён бывае самым цяжкім для кожнага студэнта. Колькі працы, колькі бяссонных начэй, колькі прачытаных старонак!

Але Крапіва бліскуча адольвае гэтую ступень у лесвіцы вучобы. На першым годзе ў БДУ Кандрат Крапіва піша не толькі байкі і вершы, якія былі змешчаны ў часопісах «Маладняк» (№№ 1, 2, 3, 5), «Малады араты» (№ 7), у газетах «Савецкая Беларусь» (№№ 70, 76, 232), «Чырвоная змена» (№№ 68—70), але і выдае першую кнігу сваёй прозы «Апавяданні» (Мінск, Выдавецтва ЦБ «Маладняка», 1926).

У сваім артыкуле «Слова да малодшых» («Заклік» № 2, 1933) Крапіва гаворыць: «Пісаў я да часу, бо не мог не адгукнуцца на тую ці іншую грамадскую з'яву». Сапраўды, большасць ранніх сатырычных вершаў і баек Крапівы выклікана да жыцця канкрэтнымі падзеямі таго часу. І цяпер не цяжка аднавіць факты, што паслужылі матэрыялам для напісання гэтых твораў.

У 1926 годзе Кандрат Крапіва ўступае ў літаратурную арганізацыю «Узвышша». Сам Крапіва так піша: «Я быў ужо не толькі слухачом і сведкай гарачых спрэчак у сценах універсітэта, але і сам прымаў у іх актыўны ўдзел. А спрэчкі ўсё разгараліся».

Так, літаратурнае жыццё ў дваццатыя гады было надзвычай бурным. У 1926 годзе раскалоўся «Маладняк». З яго выйшла група пісьменнікаў, якая аб'ядналася ў літаратурнай арганізацыі «Узвышша». Туды ўваходзілі такія празаікі і паэты, як Глебка, Дубоўка, Бядуля, Чорны, Бабарэка, Лужанін. Вось у гэты час ва «Узвышша» ўступіў і Кандрат Крапіва.

«Узвышша» ставіла перад сабой мэту змагацца за развіццё пралетарскай літаратуры. Але яго ўтварэнне было варожа сустрэта некаторымі крытыкамі і літаратурнымі аб'яднаннямі. На крытыку ў свой адрас узвышэнцы адказвалі такой жа вострай і бязлітаснай крытыкай. Крапіва высмейвае сваіх праціўнікаў у байках «Чорт», «Рахітык», «Свядомасць».

Трэба сказаць, што ў дваццатыя гады байка была адным з асноўных жанраў паэтычнай творчасці Кандрата Крапівы. Тады былі створаны амаль усе найбольш вядомыя байкі. Прызначэнне сваёй паэзіі малады сатырык бачыў у тым, каб зброяй мастацкага слова змагацца з ворагамі партыі і народа, змываць «дакастрычніцкі бруд», «наступаць на мазалі» розным прайдзісветам, падхалімам, бюракратам.

У 1926 годзе Крапіва напісаў свае шырока вядомыя байкі «Дыпламаваны Баран» і «Ганарысты Парсюк». Гэтыя байкі не страцілі сваёй выкрывальнай сілы і да нашых дзён. Некалькі слоў асобна пра «Біблію». Гэты выдатны сатырычны твор — моцны ўдар па рэлігійных канонах. Высокія ідэйна-мастацкія якасці твора прынеслі яму шырокую папулярнасць сярод чытачоў.

У 1926—1927 гг. студэнт Атраховіч піша курсавую працу «Беларускія прыказкі». Пішучы байкі, Крапіва зацікавіўся прыказкамі. Ён азнаёміўся са зборнікамі Насовіча, Раманава, сам сабраў шмат прымавак і прыказак.

Курсавая праца былога студэнта - першакурсніка Кандрата Атраховіча мае вялікае значэнне як для сённяшняга мовазнаўства, так і для літаратуразнаўства. І той факт, што яна стала глыбокім навуковым даследаваннем, гаворыць аб таленце і навуковых здольнасцях маладога пісьменніка, студэнта БДУ.

У 1927 годзе выходзіць з друку кніга К. Крапівы «Байкі». У яе ўвайшлі такія байкі, як «Фіга на талерцы», «Сава, Асёл ды Сонца», «Жаба ў каляіне», «Не губі сябе, дзяўчына». Гэтыя байкі вызначаюцца палітычнай актуальнасцю, накіраваны супраць ворагаў сацыялізму.

У тым жа 1927 годзе Крапіва пачынае друкавацца ў часопісе «Узвышша», змяшчае ў ім сваю студэнцкую працу «Беларускія прыказкі» (№ 6). Украінскі часопіс «Червоний перець» (№№ 16, 18, 19, 20) друкуе вершы беларускага сатырыка ў перакладзе на ўкраінскую мову.

У 1928 годзе побач з байкамі і сатырычнымі вершамі Крапіва піша сатырычныя апавяданні. Выходзяць яго зборнікі «Людзі-суседзі», другім выданнем— «Крапіва», «Біблія», «Байкі». Малады сатырык-студэнт выступае ў друку з артыкулам «Думкі пра сатыру» (часопіс «Узвышша» № 3). У гэтым жа годзе байкі маладога сатырыка выдаюцца ў перакладзе на украінскую мову — «Кропивнини байкі» (пераклад С. Піліпенкі, Харків, Держ. вид-во Украіны, 1928). 1928 год увогуле быў надзвычай плённым для пісьменніка. Ён шмат друкаваўся ў часопісах «Узвышша» (№№ 1, 2, 3, 4), «Беларускі піянер» (№№ 11, 24), украінскім часопісе «Всесвіт» (№ 11). Творы Крапівы карысталіся шырокай папулярнасцю ў народных масах.

У 1929 годзе, за год да сканчэння БДУ, пісьменнік піша амаль адны толькі байкі. З'яўляюцца яго «Кувада», «Каршун і Цецярук», «Так жыла між імі згода», «Махальнік Іваноў». Байкапісец працягвае весці барацьбу з чалавечымі заганамі, з перажыткамі, з ворагамі партыі і народа.

У 1930 годзе Крапіва працуе над паэмай-казкай «Хвядос — чырвоны нос», якая друкавалася ў часопісе «Узвышша» (№№ 6, 7, 8, 9, 10). Выпускае зборнік «Жывыя праявы». Друкуюцца ў часопісе «Узвышша» (№№ 1, 2) і вершы Крапівы. У гэты час паэт выдае два зборнікі сатырычных вершаў: «Пра нашых шкоднікаў, папоў ды угоднікаў» і «Ухабы на дарозе» (Мінск, БДВ, 1930). Трэцім выданнем выходзіць кніга «Крапіва».

У час вучобы ў БДУ Крапіва зацікавіўся мастацкім перакладам. На апошнім курсе універсітэта ў 1930 годзе ён пераклаў зборнік апавяданняў Чэхава «Дзівакі-нябожчыкі».

Студэнцкія гады пісьменніка былі запоўнены літаратурнымі клопатамі і напружанай вучобай. Нялёгка нават уявіць, у якіх складаных абставінах жылося тады пісьменніку-студэнту. Кандрат Кандратавіч успамінае:

— Жыў я тады з сям'ёй на Слонімскай, здымаў невялікі пакойчык. Цяжка зараз успомніць якія-небудзь канкрэтныя факты з жыцця майго студэнцкага, але адно магу сказаць: нялёгка мне тады было. Патрохі пісаў, а галоўнае — вучыўся. Атрымліваў павышаную стыпендыю.

Успамінаю нашых выкладчыкаў. Пашанцавала мне, бо я вучыўся ў такіх выдатных вучоных, як Замоцін, Барычэўскі, Піятуховіч, Гальпярына, Вазнясенскі. Асабліва падабаліся мне лекцыі Замоціна і Піятуховіча. Аднакурснікамі маімі былі Фіглоўская, Базыленка, Глебка, Якімовіч. Вельмі цікава тады было ва універсітэце.

**Г. НЯМКОВІЧ,**
**студэнтка III курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**

# 24 мая — Дзень балгарскай асветы і культуры, славянскай пісьменнасці і балгарскага друку

Да свята славянскай пісьменнасці і балгарскага друку ва універсітэце афармлена фотавыстаўка, якая расказвае аб культурных дасягненнях братняй Балгарыі. Тут прадстаўлены фатаграфіі з Сафійскага універсітэта, дзяржаўнай бібліятэкі імя Кірылы і Мяфодзія, здымкі, якія адлюстроўваюць сцэнічнае майстэрства самадзейных артыстаў.

● **У Балгарыі здзейснена абавязковае навучанне ўсіх дзяцей ва ўзросце да 16 год.**

● **У гады пятай пяцігодкі (1966—1970) навучальныя ўстановы далі народнай гаспадарцы 410305 спецыялістаў, у тым ліку 59273 чалавекі з вышэйшай адукацыяй.**

● **У Балгарыі цяпер 26 вышэйшых навучальных устаноў, 49 навукова-даследчых інстытутаў і праектных бюро, больш 40 ведамасных. У сістэме Балгарскай акадэміі навук працуе 111 інстытутаў і навуковых звенняў.**

● **Цяпер у сферы навуковай дзейнасці працуе каля 55 тысяч чалавек, у тым ліку 13 тысяч навуковых работнікаў.**

● **Актыўна дзейнічае звыш 19 тысяч культурных устаноў: клубаў-чытальняў, дамоў культуры, тэатраў, бібліятэк, музеяў.**

● **У Балгарыі налічваецца 13 тысяч калектываў мастацкай самадзейнасці, у якіх удзельнічае звыш 400 тысяч чалавек.**

● **Толькі ў 1970 годзе балгарскія самадзейныя хоры заваявалі 12 залатых медаляў на міжнародных конкурсах.**

**На свята славянскай пісьменнасці да нас у Мінск прыязджаюць балгарскія паэты Нікалай ЗІДАРАЎ, Асен БОСЕЎ і Георгі СТРУМСКІ.**
**Сёння знаёміць з імі нашых чытачоў дацэнт кафедры беларускай літаратуры, вядомы перакладчык з балгарскай мовы паэт Ніл ГІЛЕВІЧ.**

**Нікалай ЗІДАРАЎ**

## ХЛОПЕЦ

Хлопец будзіў нас у камеры песняй,
марыў пабачыць нябёс сіняву,
птушак вясёлых паслухаць на ўзлессі —
хлопец, які нам спяваў пра Маскву.

Хлопец — арол за рашоткай іржавай —
думаў пра ліўні, што пояць траву,
пра бліскавіцы ў бары над выжарай —
хлопец, які нам спяваў пра Маскву.

Былі гайдуцкія ўспомніць стараўся,
бачыў дубровы, нібы наяву,
сцежкамі горнымі ў сне прабіраўся —
хлопец, які нам спяваў пра Маскву.

А раніцою на вісельні чорнай
моўчкі на грудзі схіліў галаву.
Так і не выдаў,
не выдаў
нічога
хлопец, які нам спяваў пра Маскву!

Лівень над полем грымеў перунамі,
вецер лістоту пажоўклую скуб...
Вось і няма ўжо, няма яго з намі —
хлопца, які нам спяваў пра Маскву.

**Асен БОСЕЎ**

## І НАРЭШЦЕ

За прамоваю прамова —
Сходку сон няйначай зморыць.
Паўтары гадзіны «слова»
Балбатун ужо гаворыць.
Як пачулі: «І нарэшце...» —
Уздыхнулі ўсе з палёгкай:
Значыць, сядзе ўжо на месца,
Значыць, фініш недалёка.
Толькі дзе ж канец той, дзе ён?
Не спыняецца аратар.
І глядзім мы ўсе з надзеяй:
Ну, напэўна ж змоўкне раптам.
Не, зусім не збавіў тэмпу.
Зноўку чуем: «І нарэшце...»
І пагнаў другую тэму —
Хоць яго вы тут зарэжце!
«І нарэшце — аб маралі...»
Паўгадзіны нам балбоча:
Вучыць, бэсціць, дакарае —
Як вада ліецца з бочкі.
«І нарэшце...» — Божа мілы!
Хоць бы глотка ўжо аслабла!
І адкуль бяруцца сілы?
— Годзе! Прэч пайшоў да д'ябла!
«І нарэшце...», ды нарэшце
Сходка болей не стрывала:
Дзе ж цярпення набярэшся? —
Паваліла ў дзверы валам!

**Георгі СТРУМСКІ**

## ТАЯ, ШТО КАХАЎ Я І КАХАЮ...

Тая, што кахаў я і кахаю,
спіць салодка на руцэ маёй.
Як жыццё сваё ні прыгадаю —
разам з ёй заўсёды, разам з ёй.

Помню, светлаю парой шчаслівай
ля вакна майго мільгнула нейк —
маладой была і сарамлівай...
Не, я знаў яе яшчэ раней!

З тою, што кахаў я і кахаю,
мы кармушкі ладзілі для птах,
матылькоў лавілі каля гаю
і буквар чыталі па складах.
Цікавалі, як увечар знічка
ападзе, бы залаты ранет.
Мне была яна тады — сястрычка.
Не,
я знаў яе яшчэ раней!

Тая, што кахаў я і кахаю,
на руках мяне ўкладала спаць,
да шчакі туліла, калыхала.
Я ж не ведаў, як яе назваць.
Я не ведаў, што праз ліхалецці,
благаславёная ў вяках адна,
калі я не быў яшчэ на свеце,
да мяне спяшалася яна.

Маці,
і сястрою,
і каханай
мне была. Я вечна ўдзячны ёй.
Наспяваўшы сыну калыханак,
спіць салодка на руцэ маёй —
тая, што кахаў я і кахаю...

# ЗНАЁМЦЕСЯ



*На працягу паўгода займаецца ў БДУ пад кіраўніцтвам акадэміка Р. Ф. Габасава балгарскі аспірант Дзімітраў Іардан Пятроў. У 1966 годзе на конкурсе для паступлення ў аспірантуру ён заняў першае месца. Працаваць над дысертацыйнай тэмай «Устойлівасць дыферэнцыяльна-рэкурэнтных ураўненняў» пачаў пад кіраўніцтвам акадэміка Я. А. Барбошына.*

*Да прыезду ў Мінск Іардан Дзімітраў выкладаў у політэхнічным інстытуце ў Варне і вучыўся завочна ў аспірантуры. У Беларусі ён намерваецца апублікаваць частку сваіх даследаванняў, а затым тут жа абараніць дысертацыю.*

*На пытанне, што ў Беларусі больш за ўсё спадабалася, запомнілася, балгарскі сябар адказаў:*

*— Самае моцнае ўражанне пакідаюць сяброўскія адносіны беларусаў да балгар. І ў Мінску, і ў іншых гарадах Беларусі я адчуваў глыбокую, сардэчную добразычлівасць, якая ідзе ад самага сэрца і на якую нельга не адказаць тым жа.*

*Д. ЧАХОВІЧ.*

# БОЛЬШ ІНІЦЫЯТЫВЫ

**НЕ ТАК даўно прайшоў ва універсітэце Ленінскі залік. Ён з'явіўся тым пунктам, на якім трэба было спыніцца на момант і вызначыць, што зроблена. А зроблена нямала: ножны дзевяты студэнт БДУ — выдатнік, шмат студэнтаў займаецца ў навуковых гуртках, праводзяцца цікавыя вечары і канферэнцыі, агітбрыгады розных факультэтаў ведаюць далёка за межамі Мінска, а студэнцкія будаўнічыя атрады універсітэта — адны з лепшых. Усё гэта гаворыць аб тым, што пульс камсамольскага жыцця б'ецца не заціхаючы.**

**Але, думаецца, што ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што многім камсамольскім групам не было аб чым гаварыць на заліку. Бо не было работы. Бо сум і дрымота трывала ўсталяваліся ў іх.**

**На адным такім заліку ў I групе II курса матэматычнага факультэта мне давялося пабываць. Вяла, нецікава праходзіў залік. Камсорг зачытвала сухія характарыстыкі, дзе, акрамя пашпартных даных, нічога і не было.**

**Выходзілі да стала хлопцы і дзяўчаты. Тыя ж, хто заставаўся сядзець, амаль нічога не маглі сказаць пра сваіх сяброў.**

**Ды раптам нешта прарвалася. Зачыталі характарыстыку камсорга. Лена пачала нешта гаварыць, а потым спынілася і горача, дрыжачым ад хвалявання голасам сказала, што яна дрэнны камсорг, што не ўмее яна працаваць, а значыць і няма ў іх групе ніякай работы. Выбралі ж яе проста так, бо трэба было некага выбраць.**

**Што тут пачалося! Загаварылі гучна і ўсе разам. Гаварылі аб тым, што не будзе ў іх цікавых спраў ніколі, бо няма арганізатара. Што нават камсамольскія сходы, дзе можна было б паспрачацца, бываюць рэдка.**

**Далей апісваць падзеі не буду. Скажу толькі, што залік быў пастаўлен усім, усёй групе. Залік дзеля заліку. А ці быў зроблен вывад?**

**Хвалюючымі застаюцца і пытанні: пасіўнасць многіх камсамольцаў і адкуль яна бярэцца? І як змагацца з гэтым злом.**

**Мы ўсе добра ведаем, якімі жыццярадаснымі, энергічнымі, поўнымі надзей бываюць першакурснікі. Яны нешта прыдумваюць, праектуюць. Але... праходзіць год-два, і іх не пазнаць. Дзе падзеўся яскравы бляск вачэй, куды знік былы задор? Ужо не праблема збегчы з камсамольскага сходу, а калі і застануцца, пачытаць кніжку і машынальна галасаваць «за» і «супраць».**

**Чалавек ні ў што больш не верыць. І вінават у гэтым фармалізм, якога ох як многа з'явілася ў апошні час у пярвічных арганізацыях. Як часта ўсе справы робяцца толькі дзеля «галачкі» ў плане, а жывыя людзі з іх марамі, надзеямі і сумненнямі падмяняюцца колькасцю членаў, якія стаяць на ўліку.**

**Здараецца, што камсамольскія важакі, камітэты камсамола факультэтаў, камсамольскія бюро дрэнна ведаюць сваіх людзей. Таму не дзіва, што многіх яны проста «адкрываюць» на заліку ці ў якім-небудзь выключным выпадку. Як ні сумна, здараецца і наадварот: камсамольцы не ведаюць сваіх важакоў. Скажаце, такога не бывае? Ну, дапусцім, прозвішча ведаюць, на агульным сходзе чулі яго выступленне, а вось да іх у групу і нават на курс ён ніколі не прыходзіў. Загадзя прадчуваю, што скажуць мне на гэта: сакратар, маўляў, адзін, а груп — шмат. Дык калі так, на тое ён і камсамольскі сакратар, каб усюды паспець, каб, як кажуць, — «асабістым прыкладам»...**

**У той жа першай групе склалася іменна такая сітуацыя: ніхто не ведаў, з чаго пачаць работу, а ні камітэт камсамола, ні нават бюро курса на дапамогу не прыйшлі. Праўда, усё гэта не здымае віны з саміх камсамольцаў. Згадзіцеся, што сядзець і чакаць, калі табе паднясуць нейкую справу на «талерачцы з залатой каёмачкай», проста няёмка.**

**Фармальна падыходзяць у нас іншы раз і да выбару камсорга. Здараецца, што выбіраюць чалавека зусім недастойнага ці проста не здольнага арганізаваць людзей. Ну, а калі ўсё ж-такі памыліліся. Што тады рабіць? Зноў жа на дапамогу павінны прыйсці камітэты камсамола. І зрабіць гэта праз вучобу актыву, ды не фармальную, як гэта зачастую бывае. Дарэчы, і такая вучоба актыву праводзіцца не на ўсіх факультэтах, а дзе і праводзіцца — не заўсёды дае вынікі. Напрыклад, на матэматычным факультэце вучоба актыву праводзіцца кожны месяц, а на факультэце журналістыкі бадай што адсутнічае. Вынікі ж амаль аднолькавыя.**

**Вучоба актыву — гэта, па-першае, шчырая размова аб тым, як наладзіць работу ў групах, на курсах. Гэта сяброўскія парады, дапамога. Толькі ў такім выпадку яна прынясе карысць.**

**Зноў вяртаюся да першай групы. Тут выказалася думка, што такая сістэма заліку — фармальнасць. Што трэба проста ўзяць цікавую справу, выканаць яе — вось табе і залік.**

**Накшталт цікавай справы. У многіх склалася думка, што яна — гэта абавязкова суботнік ці збор бібліятэчкі для сельскай школы, адным словам, справа грамадская. А экскурсія ў музей, дыспут, лыжная прагулка — справа асабістая. І нельга лічыць гэта работай камсамольца, бо я ж, маўляў, для сябе раблю прыемнае.**

**Гэта таксама адна з прычын пасіўнасці. Для сябе нешта рабіць няёмка, а для грамадскасці ўсё нельга знайсці «сапраўдную» справу. Над гэтым, здаецца, варта задумацца ўсім сакратарам камітэтаў камсамола факультэтаў. Трэба павесці работу так, каб асабістае для кожнага камсамольца зліvалася з грамадскім, каб перарасло яно ў адзінае цэлае.**

**Важнае значэнне мае выкананне камсамольскага Статута. Трэба, каб камсамольскія сходы не праводзіліся ад выпадку да выпадку. Каб абмяркоўваліся там надзённыя справы.**

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

# ПРЭМ'ЕРА НА СТУДЭНЦКАЙ СЦЭНЕ

Нядаўна афіша ў галоўным корпусе аб'явіла аб прэм'еры спектакля па п'есе Арбузава «Дальняя дарога». Падрыхтаваў яе калектыў студэнцкага тэатра БДУ пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Літоўскай ССР Аляксандра Міхайлавіча Озерава.

Выбар п'есы быў не выпадковы. Тэма яго — пуцёўкі ў жыццё — блізкая і зразумелая і маладым артыстам і гледачам.

«Дальняя дарога» ад пачатку і да канца насычана рамантыкай. Пачынаецца спектакль жывым дыялогам Антона — камсамольскага сакратара метрабудаўнікоў (выканаўца — студэнт III курса матфака А. Зартайскі) з гледачом. Трэба сказаць, што Зартайскаму роля асабліва ўдалася. Ён і мяккі, і лірычны, і цвёрды ў сваёй ролі апавядальніка і ў ролі ўдзельніка падзей ў п'есе. Вельмі лёгка, свабодна, без тэатральных эфектаў іграе ён вясёлага камсамольскага сакратара Антона, які стараецца ад усёй душы уладкаваць лёс рабят са сваёй брыгады.

Здавалася б, усе падзеі, што адбываюцца ў спектаклі, вельмі простыя. Лёшка, вядомы брыгадзір метрабудаўнікоў, бярэ ў сваю брыгаду трох чалавек: не знайшоўшую месца ў жыцці Лілю Брэгман, грубаватага, нахабнага Максіма Самадзельнага і труслівага Ілью Солнышкіна. І вось усе яны ў канцы п'есы становяцца зусім іншымі людзьмі. Ліля — вядомы брыгадзір, Ілья здзяйсняе подзвіг на шахце, Максім становіцца моцным, умеючым выдатна працаваць хлопцам. Але пры ўсёй уяўнай прастаце спектаклю ўласціва асаблівая паэтычнасць у абмалёўцы вобразаў маладых метрабудаўнікоў. Ілья («Мурамец», ласкава празваны так Лёшкай) у выкананні Юрыя Будзішэўскага (ІІ курс фізфака) паўстае спачатку труслівым. Сцэна знаёмства Ільі з Лёшкай асабліва ўдалася маладым артыстам.

Ролю Лілі выканала студэнтка І курса ФПМ Люда Дубікава. Гэты вобраз уносіць у камедыю нечаканы неспакойны матыў душэўнага разладу. Гледзячы на Лілю, прыняўшую рашэнне прымчацца на апошнім трамваі ў Сакольнікі, у камсамольскі інтэрнат да Лёшкі, а пасля паверыўшую ў сябе, думаеш, што апошні трамвай павёз тады разам з мокрай хусцінкай, забытай на лаўцы, усе яе беды і засмучэнні. Але Ліля застаецца ў памяці не шчаслівым фіналам сваёй гісторыі, а яе пачаткам, калі чалавек, адчуўшы сваё адзіноцтва, пачынае шукаць выхад. Л. Дубікавай удалося паказаць усе душэўныя нелады сваёй гераіні. І зусім іншай мы бачым яе ў фінальнай сцэне спектакля. Радаснай, закаханай і шчаслівай, нарэшце паверыўшай у сябе, у свае рукі.

Нельга не адзначыць і выдатную ігру студэнта IV курса матфака В. Кір'янава (Лёшка), першакурсніка гістфака А. Касцецкага (Максім), студэнта III курса філфака Н. Панчанкі (Топсік). Асаблівай пахвалы, на мой погляд, заслугоўвае А. Касцецкі. У яго Максіма адчуваецца і напорыстасць, і бескарыснасць у адносінах да таварышаў, і нявыказаная любоў да Лёшкі.

Перад вачыма гледача героі спектакля набываюць культуру пачуццяў, праходзяць цяжкі «універсітэт» жыцця. Тэма «пуцёўкі ў жыццё» трактуецца ў п'есе як дарога да вялікіх спраў. Размова ідзе аб галоўным прынцыпе чалавечага быцця — аб суадносінах аднаго жыцця з многімі, аб тым, як і дзе сцяжынка, па якой ідзе адзін чалавек, перасякаецца з дарогамі, па якіх ідуць іншыя.

Закрываецца занавес, і глядач адчувае сябе ў здзіўляючым карагодзе людзей, асоб, лёсаў. Хочам мы ці не, а яны яшчэ доўга будуць суправаджаць нас.

Спектакль атрымаўся. Яго тэма ў нашы дні набывае новае гучанне — пошукаў дарогі ў жыцці, шчасця, якое нельга шукаць у адзіноце.

Ужо не раз радаваў сваімі спектаклямі студэнцкі тэатр універсітэта. І ў гэтым вялікая заслуга яго рэжысёра, заслужанага артыста Літоўскай ССР А. М. Озерава. Новая работа, новая сустрэча з самадзейнымі артыстамі прынесла вялікае задавальненне гледачам.

**Л. МІРАНКОВА.**

*БЫТ СТУДЭНЦКІ* — З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ КІРАЎНІКА І СПАЖЫЎЦА — *БЫТ СТУДЭНЦКІ*

## ПАТРЭБНА ДАПАМОГА

Уключыўшыся ў перадз'ездаўскае спаборніцтва, работнікі сталовай універсітэта прынялі на сябе высокія сацыялістычныя абавязацельствы, у якіх прадугледжвалася паўней і лепш задавальняць запатрабаванні студэнтаў, штодзённа мець у продажы шырокі асартымент страў, выпускаць прадукцыю толькі высокай якасці, паляпшаць культуру абслугоўвання.

Сёння можна падвесці некаторыя вынікі і расказаць аб тым, чаго дабіўся наш калектыў за мінулы 1970 і пачатак 1971 года, як справіўся ён з задачамі, якія паставіў перад сабой.

Зроблена нямала па паляпшэнню харчавання студэнтаў. За гэты перыяд у параўнанні з мінулым годам студэнтам прададзена на 14 тысяч больш гародніпных, на 6.700 малочных, на 2.500 рыбных страў. На 2 тоны было прададзена больш садавіны, на 22.500 штук яек.

Для паскарэння абслугоўвання ў часы «пік» была арганізавана раздача комплексных страў. Па суботах праводзіцца дзень беларускіх страў.

Адным з асноўных паказчыкаў добрай работы прадпрыемства з'яўляецца высокая якасць выпускаемай прадукцыі. У параўнанні з мінулым годам значна палепшылася якасць прыгатавання страў.

Асабліва хочацца адзначыць зладжаную работу брыгады буфета галоўнага корпуса (заг. вытворчасці Н. Д. Цурко, адміністратар А. С. Яцук). Гэты невялікі калектыў працуе з вялікай нагрузкай. Маючы толькі 60 пасадачных месц, ён паспявае накарміць за дзень больш 1.200 студэнтаў. Павары Ганна Сідараўна Казачонак, Галіна Гуло, Ала Хоміч з любоўю, па-дамашняму рыхтуюць абеды. Многа падзяк запісана ў кнізе водгукаў і прапаноў гэтым паварам.

З душой адносяцца да сваёй справы павары цэнтральнай сталовай Ганна Манулік, Вера Жыбрык, Марыя Тарайковіч.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1970 год пяці паварам было прысвоена званне «лепшы повар». Вялікай павагай у студэнтаў карыстаецца раздатчыца цэнтральнай сталовай Таццяна Чаркас. Вось што пішуць аб ёй у кнізе водгукаў і прапаноў: «...выказваем сардэчную ўдзячнасць і падзяку Таццяне Чаркас за сардэчныя, уважлівыя адносіны да нас. Заўсёды кранае яе чуласць і душэўны клопат. Вялікае дзякуй табе, Танечка!»

На жаль, не аб усіх работніках сталовай можна гаварыць такія цёплыя, добрыя словы. Якасць гатовых страў у вялікай ступені залежыць і ад правільнай апрацоўкі сыравіны, умелага выкарыстання паўфабрыкатаў, падтрымання правіл цеплавой апрацоўкі, ад правільнай раздачы. Але гэта не заўсёды падтрымліваецца. Адны работнікі дапускаюць парушэнні з-за няўмення, другія з-за халатнасці. У выніку — недастатковая каларыйнасць, недаважванне, недаліў.

Віноўныя строга наказваюцца. Так, за 1970 год 6 павароў і касір за парушэнні тэхналогіі прыгатавання страў і іншыя парушэнні былі паніжаны ў пасадзе. За гэты ж перыяд за розныя парушэнні на 39 чалавек накладзены адміністрацыйныя спагнанні, многія былі пазбаўлены прэміяльнай даплаты. За грубасць была пазбаўлена работы ў буфеце інтэрната № 6 буфетчыца З. А. Харламповіч.

Выкананне дзяржаўнага плана тавараабароту, высокая якасць страў, шырокі асартымент іх, культура абслугоўвання, рэнтабельнасць прадпрыемства — вось тыя асноўныя паказчыкі, якія характарызуюць работу прадпрыемства. Але для паспяховага дасягнення высокіх паказчыкаў патрэбны і належныя ўмовы.

Я хачу спыніцца на некаторых набалелых пытаннях, без вырашэння якіх цяжка справіцца з усімі вялікімі задачамі, пастаўленымі перад намі.

У першую чаргу хачу спыніцца на тым, ці можа сталовая і яе 5 буфетаў на 258 пасадачных месц задаволіць запатрабаванні і абслужыць 20-тысячны калектыў універсітэта? Вядома ж, не!

Праблема харчавання ў гэтай буйнейшай навучальнай установе рэспублікі не вырашана, хоць зразумелымі павінны быць клопаты не толькі аб тым, каб як мага больш даць краіне спецыялістаў, але і аб тым, каб гэтыя спецыялісты мелі добрае здароўе, залогам якога з'яўляецца паўнацэннае і своечасовае харчаванне. А ў нас цяпер вялікія чэргі, цесната. Цэнтральная сталовая па вуліцы Кастрычніцкай зусім не прыстасавана для такой вялікай работы, якую яна вядзе. Пабудаваная для работы на паўфабрыкатах і з такім разлікам, каб абслугоўваць толькі тых 800 студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце, яна не можа забяспечыць нармальную работу буфетаў. Малыя вытворчыя памяшканні, малая кухня, а патрэба ў прыгатаванні страў павялічваецца з кожным годам. Дастаткова сказаць, што ў параўнанні з мінулым годам першых страў сталі прадаваць на 106 тысяч больш, другіх на 140 тысяч, трэціх на 136 тысяч, халодных закусак на 246 тысяч.

На працягу доўгага часу ставіцца пытанне аб будаўніцтве так неабходнага сталовай кандытарскага цэха. Трэці год абяцанняў—і ніякай справы.

Важны паказчык — рэнтабельнасць. На жаль, сталовая універсітэта пастаянна знаходзіцца ў даўгу ў дзяржавы. Замест таго, каб за кошт прыбытку стварыць фонд эканамічнага стымулявання, сталовая ледзьледзь зводзіць канцы з канцамі. Прычына гэтаму : вялікія расходы на транспарт, і перарасход заработнай платы (за кошт таго, што сталовая працуе без выхадных дзён і ўсе святочныя дні). Але самыя вялікія страты сталовая нясе за кошт бою, лому і прапажы пасуды. У параўнанні з мінулым годам бой пасуды павялічыўся на 900 рублёў. Вялікая колькасць пасуды выносіцца са сталовай студэнтамі. Для прыкладу прывяду толькі першы квартал 1970 года. За гэты час прапала 931 вілка, 275 сталовых ложак, 869 чайных ложак, 92 блюдцы, 2.785 шклянак, 219 талерак і г. д., усяго на суму 794 рублі. Аб якой тут рэнтабельнасці і культуры абслугоўвання можа быць размова!

Тармозіць рашэнне праблемы харчавання студэнтаў універсітэта забеспячэнне, цякучасць кадраў. У сталовых, якія абслугоўваюць фабрыкі і заводы, іншыя ўмовы і прывілеі. Там сталовыя лічацца цэхам № 1, і таму іх супрацоўнікам кватэры, месцы ў дзіцячыя сады або яслі, пуцёўкі ў дамы адпачынку і санаторыі, у піянерскія лагеры выдзяляюць нароўні з рабочымі. А у работнікаў сталовай універсітэта ў гэтых адносінах няма ніякай перспектывы. Таму і не дзіўна, што ў 1970 годзе 49 чалавек звольнілася.

У гэтым годзе вядзецца грамадскі агляд работы студэнцкіх сталовых. Яго ўмовамі прадугледжана здзейсніць мерапрыемствы па паляпшэнню праектавання, будаўніцтва, значнаму пашырэнню дзейнічаючых сталовых, забеспячэнню іх неабходным халадзільным і тэхналагічным абсталяваннем, інвентаром, пасудай, сталовымі прыборамі і сучаснай мэбляй. Мяркуецца значна палепшыць якасць прыгатавання страў і культуру абслугоўвання наведвальнікаў.

Калектыў нашай сталовай распрацаваў мерапрыемствы, каб у ходзе агляду дабіцца пэўных поспехаў па паляпшэнні харчавання студэнтаў. Але выканаць мы іх зможам толькі ў тым выпадку, калі атрымаем рэальную дапамогу.

**Т. ТРАЙНОВА,**
**загадчыца сталовай № 33.**

*БЫТ СТУДЭНЦКІ*

## ІНТЭРНАТУ — УЗОРНЫ ПАРАДАК

Інтэрнат, дзе жыве студэнт, — гэта яго другі дом. І трэба, каб гэты дом быў у належным санітарным парадку, каб у ім было ўтульна, чыста, каб ён быў з густам прыбраны.

Ва універсітэцкіх інтэрнатах створаны ўсе ўмовы для нармальнага жыцця і вучобы студэнтаў. Ва ўсіх пакоях зроблен рамонт. Яны светлыя, цёплыя, дастаткова забяспечаны інвентаром.

У кожным інтэрнаце працуе буфет, ёсць душ, пакой для прыгатавання стравы, пральні і сушылкі для бялізны, пакой быту, пакоі для заняткаў і адпачынку. І прыемна зайсці ў інтэрнат № 1 па вуліцы Свярдлова, у інтэрнат № 6 па Кастрычніцкай вуліцы, дзе ў пакоях чыста і па-дамашняму ўтульна. Але зусім іншая карціна ў інтэрнаце № 4 па Паркавай магістралі. Жылыя пакоі тут знаходзяцца ў антысанітарным стане. Студэнты, часта і дзяўчаты, кураць у пакоях. Прыбіранне вядзецца дрэнна. У многіх пакоях сушыцца бялізна, рыхтуецца страва, у той час калі ў інтэрнаце ёсць цудоўная кухня, сушылка, бытавыя памяшканні, якія ўтрымліваюцца ў добрым санітарным стане. Непрыемнае ўражанне пакідаюць сваім беспарадкам пакой 225, дзе жывуць студэнты II курса філфака; пакой 38, гаспадары якога студэнткі V курса юрфака; 47 — студэнткі IV курса юрфака; 51—студэнткі IV курса юрфака; 199 — студэнткі V курса філфака; пакой 149 — студэнткі IV курса журфака.

У гэтым жа інтэрнаце жывуць студэнты-біёлагі. І які кантраст! У іх усюды чысціня і парадак.

Чаму ж кожны пакой не можа стаць узорным? Хіба ж юрысты, журналісты, філолагі не ўмеюць выконваць элементарныя санітарныя правілы?

Магчыма, умеюць, чле не хочуць. А з парушальнікамі парадку мірыцца нельга.

**Ф. РЭЗНІКАВА,**
**урач, загадчыца паліклінічнага аддзялення БДУ.**

# ПРЫЕЛАСЯ

Сярод усіх прадпрыемстваў грамадскага харчавання студэнцкая сталовая № 33 па вул. Кастрычніцкай выдзяляецца тым, што работнікі яе вырашылі абслугоўваць тых студэнтаў, у якіх узнікла жаданне сапсаваць сабе настрой. І калі такім чалавекам аказаліся вы, то смела ідзіце ў гэтую сталовую, там вас хутка давядуць да адпаведнага стану. Як толькі вы апынецеся пад яе зводамі, адразу ж кінуцца ў вочы маляўніча аформленыя сацабавязацельствы, а таксама дэвіз у вершаванай форме і меню дня беларускіх страў. Нічога паабяцанага ў гэтых плакатах у сапраўднасці вы не знойдзеце.

Ужо ля касы адчуеце, што прыйшлі не дарэмна: «вуснае» меню акажацца ў 2—3 разы карацей за надрукаванае. Але канчатковае ўяўленне аб яго памерах вы атрымаеце толькі ў раздатчыцы (вядома, калі яна ёсць). Фактычнае меню можа аказацца карацей вуснага якраз па тую страву, якая значыцца ў вашым чэку. Так дзейнічае метад «знікаючага меню». І, варта адзначыць, дзейнічае безадказна. Амаль гэтак жа ўкараніўся тут і другі прынцып: «Хто шукае, той заўсёды знойдзе». І сапраўды, інтэнсіўныя пошукі шклянак або відэльцаў-лыжак непазбежна прыводзяць вас у пасудамыйку, дзе вы і набудзеце патрэбныя прадметы.

Пакончыўшы з халаднаватым першым, спрабуючы другое, вы раптам заўважаеце, што рэальны біфштэкс не вяжацца са словам «смажаны», якое вы прачыталі ў меню. Але вы можаце ўзяць не біфштэкс, а плоў. У гэтым выпадку, гледзячы на яго, вы зразумееце, што гэта і ёсць тое самае фірменнае блюда, аб якім упамінаецца ў сацабавязацельствах. Спецыфіка яго ў тым, што рыс у ім часам замяняецца пярлоўкай, тлушч — таматным соусам, а тэхналогія прыгатавання такая, што ён нічым не ўступае вязкаму бетоннаму раствору.

Ну, вось і ўсё. Прыхапіце, калі адважыліся, кіслую смятану, выпіце халодную каву і пакідайце гэтае «гасціннае» месца, у думках выказваючы «ўдзячнасць» работнікам сталовай.

А цяпер прачытайце выпіскі з кнігі пратаколаў пасяджэнняў мясцовага камітэта сталовай № 33:

«Тав. А. даць вымову за спазненні і абыякавыя адносіны да работы».

«3-га кастрычніка на кухні рабілі пералік. Зафіксаваны злішкі на 140 рублёў. Другі пералік прайшоў нармальна».

«Недастачы быць не можа. Ёсць такое меркаванне, што прадукты «ходзяць левым бокам». Пры атрыманні іх дакументы паварамі не правяраюцца».

Як кажуць, знарок не прыдумаеш.

Усе недахопы ў сталовай № 33 можна раздзяліць на дзве катэгорыі: залежачыя ад работнікаў сталовай і не залежачыя ад іх. Першыя — работнікі сталовай могуць ліквідаваць самі, другія — павінны ліквідаваць тыя, ад каго яны залежаць. На жаль, ні тыя, ні другія нічога пакуль што не зрабілі. Бо, па крайняй меры, за 4 гады якасць страў у гэтай сталовай зусім не палепшылася, а ў галіне абслугоўвання абмежаваліся тым, што замянілі сталы і пераставілі касу. Час ад часу спрабуюць што-небудзь зрабіць студэнты. Яны пішуць скаргі, да якіх персанал даўно прывык і рэагуе гібка і звычна. Наведваюць сталовую і розныя камісіі. Вось прыклад такога наведання. У адзін з сонечных дзён студзеня 1971 года, адкрыўшы дзверы ў сталовую, можна было адчуць, што біфштэксы сёння смажаныя. Міжволі наведвальнік пачынаў шукаць прычыну. Яна была відавочнай. За сталом у зале сціпла сядзелі некалькі чалавек. Ад іншых яны адрозніваліся толькі тым, што іх асабіста абслугоўвалі работнікі сталовай, і яшчэ у якасці гарніру ў іх стравах быў рыс, у той час як іншыя наведвальнікі задавальняліся вязкай «фірменнай» грэчкай. У наступныя дні ўсё было па-старому.

Работнікі сталовай, відаць, лічаць, што абавязацельствы браць трэба, а выконваць зусім не абавязкова.

**П. САБІНСКІ,**
**студэнт IV курса матфака.**

Згублены студэнцкі білет за № 661922, выдадзены на імя студэнткі матфака БДУ Качан Эсфір Самуілаўны, лічыць несапраўдным.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 647. АТ 08659